# Рэцэнзіі

У. К. Касько. **Святло далёкай зоркі**. Мн.: "Універсітэцкае", 1997. 319 с.

Даследчыкі традыцыйнай культуры атрымалі цудоўны падарунак – прыгожа афармленае выданне фундаментальнай манаграфіі аб шматграннай дзейнасці выдатнага беларускага вучонага, ураджэнца вёскі Бялевічы на Случчыне Аляксандра Казіміравіча Сержпутоўскага (1864–1940).

Паўстагоддзя гэты руплівец на ніве беларусазнаўства аддаў даследаванню глыбінных з'яў духоўнай культуры беларусаў і іншых народаў. Сорак пяць прац, з якіх кожная другая фундаментальная, напісаў ён па выніках сваёй збіральніцкай і даследчыцкай дзейнасці фалькларыста і публіцыста. Тры з іх – "Сказки и рассказы белорусов-полешуков" (1911), "Казкі і апавяданні беларусаў з Слуцкага павета" (1926), "Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў" (1930) – пераконваюць, што асноўнай крыніцай для навуковай дзейнасці А.Сержпутоўскага было Палессе, яго фальклор, старажытныя вераванні, духоўная культура.

Тэрыторыя для даследаванняў, збіральніцкай дзейнасці была акрэслена больш чым трапна. І ў наш час, а тым больш на мяжы XIX і XX стст., традыцыйная культура на Палессі існавала і існуе ў натуральных умовах і захоўвае яшчэ ў некранутым выглядзе найбольш старажытныя формы.

Асобна трэба акцэнтаваць увагу на асноўных прынцыпах фіксацыі Сержпутоўскім звычаяў, абрадаў, свят, рытуалаў. Гэта рабілася ў непарыўнай сувязі з апісаннямі жыцця народа, яго паўсядзённага побыту, у кантэксце месца фальклору і абрадаў ці свят, рытуалаў, звычаяў, вераванняў у гэтым жыцці і побыце. Больш таго, Сержпутоўскі фіксаваў не толькі з'явы духоўнай культуры, але і матэрыяльнай, у першую чаргу той яе часткі, якая арганічна звязана з традыцыйнай культурай. Сабраныя ім калекцыі захоўваюцца пераважна ў архівах Расійскага этнаграфічнага музея, Расійскай акадэміі навук, Дзяржаўнага Рускага музея (усе ў Санкт-Пецярбурзе). Разам з тым асобныя працы вучонага У.Касько адшукаў у навуковых архівах Масквы, Вільнюса, Мінска. Гэта робіць яго кніжку яшчэ больш каштоўнай.

Пасля біяграфічнай мастацкай замалёўкі аб апошнім дні жыцця Сержпутоўскага ідуць трынаццаць раздзелаў у кнізе, якія паслядоўна развіваюць творчы складаны шлях Сержпутоўскага і яго самаахвярную навукова-даследчыцкую і папулярызатарскую дзейнасць. Сярод іх вызываюць асаблівую цікавасць "Шлях у навуку", "Палескі дзівасіл", "У вянок народнай мовы", "На крылах песні".

На высокім навукова-тэарэтычным узроўні пададзены ў кнізе чатыры дадаткі песень, прыказак, прымавак і выслоўяў з запісаў Сержпутоўскага, справаздача аб яго экспедыцыі на Гомельшчыну ў 1926 г., спіс літаратуры, персанальны бібліяграфічны і архіўны паказальнікі прац Сержпутоўскага. Ва ўступе да кнігі У.К.Касько вызначае месца вучонага ў навуцы: "А.К.Сержпутоўскі пакінуў прыметны след у гісторыі вывучэння народнай творчасці беларусаў. Яго працы па фальклору, этнаграфіі, мовазнаўству, даследаванні народнага быту, звычаяў, маралі не толькі ўзбагацілі айчынную навуку, але пераканаўча засведчылі мастацкі талент народа, філасофскі склад розуму, востры сацыяльны погляд яго на свет, упісалі залаты радок у справу нацыянальнага Адраджэння".

Тое, што ў манаграфіі Уладзіміра Касько ўсебакова адлюстравана разнастайная дзейнасць Сержпутоўскага – збіральніка, даследчыка, выдаўца, публіцыста, літаратара і папулярызатара духоўнай культуры народа, – робіць яе своеасаблівай энцыклапедыяй, якая дапамагае нам лепш пазнаць багаты змест духоўнага і матэрыяльнага побыту беларусаў.

**В.Дз.Ліцвінка**